| ПРЭЗІДЫУМ ШЧУЧЫНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ | ШЧУЧЫНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ |
|---|---|

РАШЭННЕ

24 лістапада 2017 г. № 139/981
г. Шчучын

Аб утварэнні Шчучынскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць восьмага склікання

Разгледзеўшы пратаколы кіруючых органаў раённых грамадскіх аб’яднанняў, заявы грамадзян аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад Шчучынскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць восьмага склікання, ў адпаведнасці з артыкуламі 24, 34, 35 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прэзідыум Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў і Шчучынскі раённы выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЛІ:

1. Стварыць Шчучынскую раённую выбарчую камісію па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць восьмага склікання ў колькасці адзінаццаці чалавек у наступным складзе:

Бакун Валянціна Іосіфаўна, вылучана Шчучынскай раённай арганізацыяй грамадскага аб’яднання “Беларускі фонд міру”;

Валошык Вольга Міхайлаўна, вылучана заявай выбаршчыкаў;

Вількевіч Анастасія Іванаўна, вылучана Шчучынскай раённай арганізацыяй грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”;

Галамбоўскі Валянцін Вікенцьевіч, вылучаны заявай выбаршчыкаў;

Жукоўскі Васілій Сяргеевіч, вылучаны Шчучынскай раённай арганізацыяй Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму;

Іваноўская Людміла Мікалаеўна, вылучана Шчучынскай раённай арганізацыяй грамадскага аб’яднання "Беларускі саюз жанчын”;

Леаневіч Алена Іванаўна, вылучана заявай выбаршчыкаў;

Міхалоўскі Алег Аляксандравіч, вылучаны заявай выбаршчыкаў;

Пашук Юрый Тадэвушавіч, вылучаны Шчучынскай раённай арганізацыяй Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Белая Русь”;

Серахан Лілія Генрыхаўна, вылучана Шчучынскай раённай арганізацыяй Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аграпрамысловага комплексу;

Турэвіч Анжэла Станіславаўна, вылучана Шчучынскай раённай арганізацыяй Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.

2. Вызначыць месца знаходжання Шчучынскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць восьмага склікання: горад Шчучын, плошча Свабоды, 11, зала паседжанняў Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў, тэлефон 28835.

3. Упаўнаважыць прадстаўніка Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта прадстаўляць інтарэсы прэзідыума Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў і Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта ў судзе ў выпадках абскарджання гэтага рашэння ў судовым парадку.

4. Апублікаваць дадзенае рашэнне ў раённай газеце “Дзянніца”.

Старшыня Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў

Шчучынскі раённы Савет дэпутатаў
ДЛЯ ДАКУМЕНТАЎ

І.Ю.Сакалоўскі

Старшыня Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта

С.В.Ложэчнік

Кіраўнік спраў Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта

А.В.Давыдава